2) Я. Купала (113)
3) Я. Колас (121)
4) Е. Полоцкая (107)
5) К. Калиновский (105)
6) А. Лукашенко (94)
7) Н. Гусовский (64)
8) К. Туровский (53)
9) П. Машеров (47)

В целом, было названо более 50-ти имен. Отдадим должное таким политикам XX века как А. Лукашенко и П. Машеров — личностям действительно незаурядным. Остальные семь фамилий могли бы быть названы с тем же перевесом и полвека назад, разве что количество названных имен могло быть иным. Это доказывает, что в учебной литературе, перенасыщенной фактологией, изобилует клише, отсутствует новое идеологическое осмысление. История оживает и проникает в душу только в устах ее трактователей. И в том, чтобы сделать знания по истории основой для формирования национального самосознания и патриотизма, требуется немалая работа методистов и преподавателей курса. Частично противоречия могут быть разрешены в случае реального отражения в политике Республики Беларусь настроений преемников ее истории — нашей молодежи.

## ШЛЯХІ І СРОДКІ ФАРМІРАВАННЯ ПАТРЫЯТЫЗМУ СТУДЭНЦКАЙ МОЛАДЗІ

Міхальчук М.П.
г. Брэст, БрДУ

Праблема выхавання моладзі ў духу грамадзянскасці, патрыятызму з'яўляецца актуальнай, важнай і дастаткова складанай. Яе значнасць тлумачыцца дынамізмам працэсаў, якія працякаюць у грамадстве і патрабуюць у сваю чаргу адэкватнага асэнсавання. Складанасць абумоўлена тым, што для часткі моладзі страцілі свой глыбокі сэнс, не разглядаюцца як агульначалавечыя каштоўнасці такія паняцці як “радзіма”, “патрыятызм”, “духоўнасць”, “маральнасць”.

Вядомы педагог В.А.Сухамлінскі заўважаў, што ў свядомасці, пачуццях, маральных паводзінах студэнцкай моладзі найбольш яскрава адлюстраваны тыя карэнныя змены, якія адбываліся і адбываюцца ў грамадскім жыцці. Сур'ёзнай перашкодай на шляху распрацоўкі праблем патрыятычнага выхавання вучнёўскай моладзі з'явілася ідэалагізаваная трактоўка савецкага патрыятызму, адсечанага ад сваіх нацыянальна-гістарычных каранёў, празмерная яго палітызацыя, абсалютызацыя класавага зместу і недаацэнка

чалавечага фактару. У структуры патрыятызму практычна адсутнічаў эмацыянальна-асобасны кампанент, амаль праігнараваны нацыянальны.

Новае мысленне у выхаванні прадугледжвае павышэнне ролі нацыянальнага пачатку, які ніколькі не паслабляе пачуццё павагі моладзі да іншых народаў, да іх культурнай спадчыны. Узрастаючае значэнне нацыянальнага кампаненту ў патрыятызме - гэта не сведчанне перавагі індывідуальных асаблівасцей гістарычнага працэсу над агульнымі яго заканамернасцямі, нацыянальных інтарэсаў над інтэрнацыянальнымі.

Тэорыя і практыка выхаваўчай работы з моладдзю сведчыць, што ў Беларусі таксама назапашаны пэўны вопыт патрыятычнага выхавання на гераічным мінулым нашага народа, на подзвігах герояў вайны.

Разам з тым, зроблены аўтарам у ходзе даследавання аналіз выхаваўчай работы шэрагу вышэйшых навучальных устаноў Беларусі паказаў неадпаведнасць зместу і форм патрыятычнага выхавання студэнтаў грамадскім працэсам, калі рост нацыянальнай свядомасці часам мяжуе з нацыянальным нігілізмам, з раўнадушшам, апатыяй ці абыякавымі адносінамі да сваей нацыянальнай гісторыі, культуры. Таму зразумела, што педагагічная навука актыўна шукае новыя шляхі для вырашэння праблемы фарміравання патрыятызму, грамадзянскасці на аснове аксіялагічнага падыходу да працэсу патрыятычнага выхавання.

Аналіз адпаведнай літаратуры і даследванняў дае магчымасць разглядаць патрыятызм як частку грамадскай свядомасці у выглядзе сістэмы поглядаў, тэорый ці складаную з'яву грамадскага жыцця, элементам якой з'яўляецца пачуццё адданасці Айчыне і любві да яе, з аднаго боку. А з другога - патрыятызм - гэта высакародная маральная якасць чалавека, якая ўключае яго эмацыянальна-станоўчыя адносіны да Радзімы, яе гісторыі, мовы народа, прыроды, традыцый і звычаяў, грамадскага жыцця і праяўляецца у глыбока ўсвядомленым пачуцці любві да яе, імкненні ўдзельнічаць у працы на карысць Бацькаўшчыны.

Рэальнасць пацвярджае, што менавіта маральны змест патрыятызму здольны стаць эфектыўным механізмам кансалідацыі і згоды інтарэсаў розных пакаленняў людзей. Ён абумоўлены неабходнасцю спалучэння каштоўнасных арыентацый, адрасаваных грамадству і кожнай канкрэтнай асобе. Актыўны пошук шляхоў вырашэння праблемы патрыятычнага выхавання моладзі на аснове аксіялагічнага (каштоўнаснага) падыходу прывёў нас да выкарыстання у якасці эфектыўнага і дзейснага сродку фарміравання патрыятызму будучых настаўнікаў - краязнаўства. На гэта скіроўвае і стратэгія рэфармавання сістэмы выхавання Рэспублікі Беларусь.

Вывучэнне свайго краю, роднай прыроды, гісторыі, нацыянальных традыцый прызнаецца цяпер найбольш важным ва ўсей сістэме выхавання. Краязнаўства станоуча спрыяе выхаванню маральнасці асобы, гонару і адказнасці за сваю Радзіму. Яно дазваляе вывесці моладзь на узровень разумення нацыянальнай, а потым і сусветнай культуры. Веданне гісторыі свайго краю дазваляе па-новаму ставіцца да перабудовы мыслення ў адносінах да мінулага, сённяшняга дня і будучыні. Гэта значыць, што краязнаўства ўтрымлівае аб'ектыўную аснову для таго , каб не дапусціць абстрактнага, апалагетычнага характару патрыятызму. Вечная каштоўнасць краязнаўства ў тым, што яно устанаўлівае і падтрымлівае сувязь часоў, пакаленняў, іх пераемнасць у родным горадзе, сяле, краі, захоўвае гістарычную памяць.

Вядучымі шляхамі фарміравання патрыятызму студэнцкай моладзі з'яўляюцца: сістэматычнае, мэтанакіраванае ўключэнне краязнаўчага матэрыялу ў вучэбна-выхаваўчы працэс ВНУ і арганізаваная на педагагічнай аснове сумесная пазааўдыторная краязнаўчая дзейнасць выкладчыкаў і студэнтаў. Даследванне паказала, што невычэрпны выхаваучы патэнцыял сродкаў краязнаўства выкарыстоўваецца у сучасны момант недастаткова. Вынікі апытання выкладчыкаў розных факультэтаў шэрагу ВНУ Беларусі паказалі, што прымяненне сродкаў краязнаўства на занятках носіць эпізадычны характар, тым больш недаацэньваецца іх выхаваўчы ўплыў на станаўленне асобы. Так, абсалютная большасць выкладчыкаў (98% ад агульнай колькасці апытаных - 196) прызнаюць актуальным выкарыстанне сродкаў краязнаўства ў цэласным педагагічным працэсе. Аднак, сістэматычна ўключаюць мясцовы матэрыял пры выкладанні сваіх дысцыплін 44%; 37% - "эпізадычна"; астатнія не ўключаюць наогул, спасылаючыся на спецыфіку прадметаў, адсутнасць неабходнай літаратуры і іншыя прычыны. Сярод тых, хто выкарыстоўвае сродкі краязнаўства сістэматычна, кожны другі - выкладчык гісторыі, геаграфіі, біялогіі, літаратуры і кожны пяты - выкладчык дысцыплін псіхолага-педагагічнага цыклу. Гэта значыць, што часцей рэалізуецца вузкапрадметны аспект краязнаўства, які супадае са спецыялізацыяй, а міжпрадметны (арганізацыя пазааўдыторнай краязнаўчай дзейнасці) яшчэ не знайшоў адпаведнай рэалізацыі. Даследванне мэты выкарыстання краязнаўчага матэрыялу прывяло да наступных аргументаў: "з мэтай канкрэтызацыі і паглыблення ведаў па прадмету" - 36%; "для фарміравання пазнавальнага інтарэсу да сваей дысцыпліны" - 29%; "у выхаваўчых мэтах" - 26%; астатнія - "для ілюстрацыі агульнанавуковых палажэнняў".

Выхаваўчы уплыў сродкаў краязнаўства на фарміраванне патрыятызму асобы тлумачыцца яго поліфункцыянальнай сутнасцю: здольнасцю аднначасо-

вага ўздзеяння на свядомасць, пачуцці і паводзіны асобы, паколькі прадугледжвае авалоданне канкрэтнымі аб'ектыўнымі ведамі аб спецыфічных асаблівасцях развіцця краю, якія адшукваюцца ў працэсе яго паглыбленага вывучэння і аказваюць вялікае эмацыянальна-стымулюючае ўздзеянне на чалавека, пабуджаюць яго да адпаведных дзеянняў, выконваюць тым самым ролю матываў, патрэбнасцяў. Практычны бок краязнаўства носіць заўсёды характар грамадска-карыснай дзейнасці, глыбока гуманістычнай па зместу. Зразумела, што веды самі па сабе не фарміруюць чалавека і яго якасці. Значэнне маюць тыя веды, якія сталі каштоўнаснымі арыентацыямі і з'яўляюцца вынікам роздуму і перажыванняў асобы, уплыву сацыяльных умоў і мэтанакіраванага выхавання.

Працэс выхавання патрыятызму ўключае ў сябе фарміраванне патрыятычнай свядомасці як сістэмы ведаў, пачуццяў, перакананняў, каштоўнасных арыентацый і установак, звязаных з успрыманнем Бацькаўшчыны і фарміраваннем адносін да яе, развіцця патрыятычных пачуццяў і выпрацоўкі навыкаў і звычак адпаведных паводзін.

Асноўнымі шляхамі павышэння эфектыўнасці фарміравання патрыятызму моладзі сродкамі краязнаўства з'яўляюцца: далучэнне яе да скарбаў нацыянальнай культуры, гісторыі, традыцый свайго краю, яго людзей; выхаванне цікавасці да мінулага, сучаснага развіцця і будучыні краю, заклапочанасці экалагічным станам родных мясцін, адказнасці за захаванне яго гістарычнай, культурнай і прыроднай спадчыны.

Адметнай умовай павышэння эфектыўнасці патрыятычнага выхавання сродкамі краязнаўства з'яўляецца захаванне сістэматычнасці і пераемнасці ў краязнаўчай дзейнасці студэнтаў на працягу ўсяго перыяду навучання ў вышэйшай навучальнай установе. Рэалізацыя названай умовы забяспечвае бесперапыннае і паслядоўнае станаўленне ў асобы сістэмы ведаў аб родным краі, развіццё станоўчых эмацыянальных адносін і імкненне да актыўнай дзейнасці з апорай на дасягнуты ўзровень сфарміраванасці патрыятычных перакананняў. Тым больш, што глыбіня патрыятычных пачуццяў вызначаецца багаццем і шматграннасцю ўяўленняў і думак аб Радзіме, імкненнем да дзейнасці на яе карысць .

Прызнаючы педагагічную вартасць кожнага з напрамкаў краязнаўства, якія паступова атрымліваюць развіццё ў сістэме вышэйшай адукацыі, першаступеннае значэнне ў фарміраванні сістэмы ведаў аб родным краі і выхаванні на гэтай аснове патрыятызму мае, на погляд аўтара, гістарычнае краязнаўства. Яно разглядаецца перш за ўсе не толькі як самастойны прадмет вывучэння,

але і як прынцып навучання і выхавання на мясцовым матэрыяле. Яго адметнасць у тым, што гэта і вобласць навуковага гістарычнага пазнання , і сфера актыўнай практычнай дзейнасці тых, каго цікавіць гісторыя родных мясцін.

Такім чынам, фарміраванне патрыятызму студэнцкай моладзі сродкамі краязнаўства - гэта цэласная сістэма краязнаўча-педагагічнай дзейнасці выкладчыкаў і студэнтаў, скіраваная на забеспячэнне іх грунтоўнымі ведамі аб гісторыі, культуры і прыродзе роднага краю, на фарміраванне іх патрыятычных пачуццяў і гатоўнасці да патрыятычнай дзейнасці.

## ЭКСКУРСИОНАЯ ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ КАК СРЕДСТВО ФОРМИРОВАНИЯ ПАТРИОТИЧЕСКОГО СОЗНАНИЯ СТУДЕНТОВ (ИЗ ОПЫТА КУРАТОРСКОЙ РАБОТЫ)

Шебанова И.А.
БПИ, г. Брест.

В наше время все чаще приходится слышать о кризисных явлениях в духовном становлении молодежи, что выражается в забвении традиций многовековой национальной культуры, распространении воинствующей бездуховности, ориентации молодежи на самые низкие культурные образцы, в отсутствии интереса к историко-культурному наследию, потребности в его освоении и развитии, в отсутствии устойчивых эмоционально-ценностных отношений к Родине, ее культуре, искусству, людям, природе. Вряд ли безразличное или негативное отношение к своему народу и своей Отчизне способствует формированию жизнеспособной личности с гражданским достоинством и ответственностью и правильной ценностной ориентацией.

Понятия "патриот" и "патриотизм" пришли к нам из французского языка и не имеют аналога в русском языке. В обществе под патриотизмом традиционно понимается преданность и любовь личности к своей Родине, к своему народу, гражданственность, выраженная в активной деятельности на благо Родины. Личность - существо общественное. Она может сформироваться, существовать и развиваться только в исторически определенных общностях, вступая в различные формы общения между собой, организуя совместный труд, давая жизнь, знания и опыт новым поколениям. Рождение человека и приобщение его к природной и социальной среде, к культуре, языку, ко всей системе социальных ценностей откладывается в виде комплекса впечатлений, опыта, ориентаций.

Человек не может быть нейтральным к тем условиям, в которых родился, жил и формировался как личность. Родной язык, культура, традиции становятся частью его духовного мира. Возникает особый настрой, особое чувст-